# ВОБРАЗ «НОВАЙ» ЖАНЧЫНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ДЗІН ЛІН

*А.А.Станкевіч (Мінск, МДЛУ)*

В статье рассматривается понятие «новой женщине» в период китайской модернизации, а также ее представления в литературе писателей-женщин, впервые получивших возможность выступить в качестве нарраторов. Устанавливаются основные составляющие женского образа в малой прозе раннего периода творчества Дин Лин как одной из самых продуктивных писательниц своего поколения, обусловленные культурным и социально-экономическим положением Китая первой половины двадцатого века, сближающие и отличающие главных героинь ее произведений от главных героинь, созданных другими писательницами группы Четвертого мая.

Ключевые слова: Дин Лин; образ женщины; эмоциональность; Четвертое мая.

# THE FEMALE IMAGE IN DING LING'S WORKS

*A.A.Stankevich (Minsk, MSLU)*

This article examines the concept of the "new woman" in the period of Chinese modernisation and her representation in the literature of women writers who were first given the opportunity to act as narrators. The article establishes the main components of the female image in the small prose of Ding Ling's early period as one of the most productive writers of her generation, conditioned by the cultural and socio-economic situation of China in the first half of the twentieth century, which converge and distinguish the protagonists of her works from the protagonists created by other writers of the May Fourth group.

Keywords: Ding Ling; image of woman; emotionality; May Fourth.

Тэрмін "новая жанчына" выкарыстоўваўся і распаўсюджваўся інтэлектуаламі Чацвёртага мая ў процівагу ўяўленням пра традыцыйную кітайскую жанчыну, скаваную шматвяковым канфуцыянскім этыкетам і неіснуючую без удзелу мужчыны ў яе жыцці [1, с.5]. Пісьменнікі Чацвёртага мая, у тым ліку самыя жанчыны, якія атрымалі магчымасць апісаць у літаратуры недапрадстаўлены жаночы вопыт ад першай асобы, стварылі беспрэцэдэнтную колькасць выдуманых вобразаў новай жанчыны [1, с.7].

Дзін Лін была адной з самых пладавітых і высокашанаваных пісьменніц з групы Чацвёртага мая. Прааналізаваўшы творы ранняга перыяду яе творчасці («Дзённік міс Сафіі», «Дзяўчына Амаа», «Мэнкэ» і інш.), можна вылучыць наступныя рысы, якія ляжаць у аснове яе жаночага вобраза:

1) адмаўленне эмацыянальнасці. Першая прычына – сацыяльныя ўмоўнасці (гэтае пытанне ўжо знаходзіла адлюстраванне ў літаратуры раней у творы "Падарожжа" Фэн Юаньцзюнь, але ў Дзін Лін падобныя ваганні паміж "традыцыйнымі" і "сучаснымі" каштоўнасцямі тычацца не проста свабоды выказвання пачуццяў, а дагэтуль табуіраванай сэксуальнасці жанчын) і набыццё нефармальнай улады (несентыментальнасць успрымаецца як рацыянальнасць, і гэта набліжае жанчыну да мужчыны).

2) Вобразы жанчын часта будуюцца на кантрасце з мужчынамі, якія паказваюцца як слабыя і бязвольныя, што робіць жаночую постаць моцнай духам і аўтаномнай: «"*Who's bullying you, Weidi? Who made you cry and throw*

*this tantrum?"»* [2, с.66], альбо грубыя і ганарыстыя. У другім выпадку жанчыны церпяць адносіны "зверху ўніз" і не ўспрымаюцца як асобы.

3) Адсутнасць апоры і падтрымкі ў жанчын. У аповесці «Мэнкэ» за выявай мужчыны-настаўніка, які павінен навучаць і выхоўваць вучняў, хаваецца чалавек, які злоўжывае сваёй уладай. Галоўная гераіня на першых жа старонках страціла веру ў настаўніка, які павінен з'яўляцца рэферэнтнай асобай для вучня. Пра маці Мэнкэ таксама нічога не вядома, як і пра маці Сафіі.

4) Самастойны пошук сябе праз падарожжа (у тым ліку і духоўнае, напрыклад, у «Дзяўчыне Амаа»). Гэтая думка транслюецца яшчэ ў самым першым апавяданні Дзін Лін "Мэнкэ": *«Вольна насіцца па хвалях – вось жыццё, якое мне патрэбна»* [3].

5) Песімізм, якім прасякнуты многія творы жанчын-пісьменніц Чацвёртага мая. Аднак у Дзін Лін гэта пагаршаецца хваробным станам яе гераінь [4, с.107], які з'яўляецца не проста фізічнай з'явай, а мае сацыяльнае вымярэнне. Вобраз хворай жанчыны – вобраз хворага грамадства. І калі міс Сафія паўстае перад чытачом адразу хворай, то галоўная гераіня Амаа хварэе ўжо ў канцы апавядання, калі ўсведамленне праблем прыводзіць да ўнутранага канфлікту, і гэта фізічна адбіваецца на яе здароўі. Амаа прыйшла да высновы, што «*自身是始终也不 能尝着这甘味*» [5] і скончыла жыццё самагубствам.

6) Галоўныя гераіні – не толькі інтэлігенцыя, якая была ў цэнтры ўвагі іншых аўтараў; "Дзяўчына Амаа" з'яўляецца спробай Дзін Лін уключыць сялянак у свае разважанні пра сучаснасць, прыгнёт жанчын і класавы падзел.

7) Вестэрнізаванасць, што праяўляецца ў тым ліку і ў імёнах (Сафія). Лёс жанчын больш не звязаны з сям'ёй;

Дзін Лін была пісьменніцай, чыё жыццё і творчасць звязаны з рэвалюцыяй. Яна выступала за вызваленне кітайскіх жанчын ад "канфуцыянскай" сям'і і стварэнне "новых" жанчын, каб садзейнічаць нацыянальнай мадэрнізацыі, і свае літаратурныя інтарэсы яна імкнулася ўвязаць з патрабаваннямі партыі. Аднак паміж партыйнымі запытамі на літаратуру і ўласнай сумленнасцю яна часта выбірала апошняе, прэтэндуючы на праўду і рэалізм у сваіх працах: апісвала разбураную гаспадарку, звяртала ўвагу на зніжаны культурны ўзровень насельніцтва, скалечанае няправільным выхаваннем пакаленне моладзі, грэблівае стаўленне да жанчыны, цяжкія ўмовы сялянскай працы.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Feng, Jin. New Woman in Early Twentieth-Century Chinese Fiction / Jin Feng. – Purdue University Press, 2004. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://docs.lib.purdue.edu/ccs/2. – Дата доступу: 18.02.2024.
2. Tani, E. B. I myself am a woman : selected writings of Ding Ling / E. B. Tani. – Boston : Beacon press, 1989. – P. 81.
3. 丁玲，梦珂/ 丁玲. – 《小说月报》, 一九二七年 = Дзін Лін, Мэнкэ / Дзін Лін // Штомесячнік мастацкай літаратуры, 1927 [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://www.kanunu8.com/book3/8372/186027.html. – Дата доступу: 18.02.2024.

4. Yi, Wu. Transformation of Diseased Women in Ding Ling's Novels – Based on the Metaphor of Disease / Yi Wu // International Journal of Languages, Literature and Linguistics, – Vol. 7. – No. 3. – 2021. – P. 106 – 110.

5. 丁玲，阿毛姑娘/ 丁玲. –《小说月报》，一九二八年. = Дзін Лін. Дзяўчына Амаа / Дзін Лін // Штомесячнік мастацкай літаратуры 1928. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://www.kanunu8.com/book3/8372/186100.html. – Дата доступу: 18.02.2024.